# Славутыя землякі на карце свету

Імёны славутых ураджэнцаў беларускай зямлі ўвекавечаны не толькі ў Беларусі, але і на картах іншых краін свету. У гонар нашых землякоў названы вуліцы, скверы, пасёлкі, гарады, паўастравы, горныя хрыбты і вяршыні, мысы, выспы, залівы, нават кратары на Месяцы, Марсе, Меркурыі і малыя планеты. Аб існаванні большасці такіх назваў беларусы амаль не ведаюць. А шкада, бо гэта яшчэ адзін слушны доказ таго, якая багатая на таленты беларуская зямля.

## Асабістыя вяршыні



Ігнат Дамейка

Шмат геаграфічных аб’ектаў у розных частках свету названы ў гонар выхадцаў з беларускай зямлі, якія сталі вядомымі даследчыкамі і вучонымі. Нашы землякі ўнеслі значны ўклад у развіццё геаграфіі, геалогіі, астраноміі, фізікі, біялогіі, палеанталогіі, лексікаграфіі і іншых галін навукі. І пункты на карце сведчаць пра тое, што іх працу ацанілі належным чынам.

Лідзіруе сярод нашых суайчыннікаў па колькасці назваў у свой гонар выдатны геолаг, мінеролаг, географ Ігнат Дамейка. Яго імя носяць дзясяткі аб’ектаў у розных краінах свету, але больш за ўсё – у Чылі. На карце гэтай далёкай лацінаамерыканскай краіны ёсць названыя яго імем горад, пасёлак, вуліцы ў розных гарадах, а таксама горны хрыбет у Андах – Кардыльера Дамейка працягласцю амаль 600 км.

Ігнат Дамейка паходзіў са шляхецкага роду, які не адно пакаленне жыў на беларускіх землях. Нарадзіўся ён 31 ліпеня 1802 года ў маёнтку Мядзведка Навагрудскага павета (цяпер – Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). Родныя мясціны вымушаны быў пакінуць пад пагрозай пакарання за ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1830–1831 гадоў.

▼ Кардыльера Дамейка



У Чылі Ігнат Іпалітавіч пражыў амаль паўстагоддзя, заслужыўшы ў чылійцаў ганаровае званне «Грандэ эдукадор» («Вялікі асветнік»). Працуючы на пасадзе рэктара нацыянальнага ўніверсітэта, ён рэфармаваў не толькі саму вышэйшую навучальную ўстанову, але і ўсю сістэму адукацыі краіны. Менавіта Дамейка падрыхтаваў першых спецыялістаў для гарнаруднай прамысловасці Чылі, а па напісаных ім падручніках вучылася не адно пакаленне лацінаамерыканскіх студэнтаў.

Вялікі ўклад зрабіў наш суайчыннік і ў асваенне чылійскіх нетраў: падчас арганізаваных ім экспедыцый былі адкрыты і пачалі асвойвацца багатыя радовішчы золата, серабра, медзі, каменнага вугалю. Вучоны склаў першую геалагічную карту краіны, а дзякуючы адшуканым ім крыніцам чыстай вады ў Сант’яга з’явіўся вадаправод. За шматлікія заслугі перад краінай Ігнат Дамейка быў прызнаны нацыянальным героем Чылі.

Нягледзячы на такую насычаную навуковую і педагагічную дзейнасць, Ігнат Іпалітавіч вельмі сумаваў па радзіме. У лістах да родных і сяброў ён пісаў аб гарачым жаданні вярнуцца і паслужыць свайму краю. Расказваў, як, дабраўшыся да вяршыняў Кардыльераў, першым чынам паглядзеў на ўсход, дзе была родная старонка. Каменныя груды ў яго былі «велічынёй з нашу хату», мясцовая рэчка – «шырынёй

з наш Буг». У 82 гады ён пакідае пасаду рэктара ўніверсітэта і нарэшце наведвае родны край. Дамейка пражыў тут чатыры шчаслівыя гады. Памёр ён неўзабаве пасля вяртання ў Сант'яга.

Беларусы, якім давялося падарожнічаць па Чылі, адзначаюць, што памяць пра Ігната Дамейку беражліва захоўваецца па сённяшні дзень. Імя нашага суайчынніка можна сустрэць па ўсёй краіне, і не толькі ў геаграфічных назвах. У чылійскім горадзе Ла-Серэна, што знаходзіцца побач з першым месцам працы вучонага, гарадком Какімба, у гонар «Грандэ эдукадора» названы ўніверсітэт і музей мінералогіі. У розных населеных пунктах Чылі стаяць помнікі Дамейку, у тым ліку – на ўваходзе ў нацыянальны ўніверсітэт у Сант'яга.

Цэлы «россып» геаграфічных аб'ектаў увекавечвае імя іншага нашага земляка вядомага даследчыка Сібіры, географа, геолага, палеантолага Івана Чэрскага. У іх ліку – горны хрыбет у Забайкаллі, горная сістэма ў Якуціі, вулкан ва Усходнім Саяне, мыс і заліў на Байкале, пасёлак гарадскога тыпу Чэрскі.

Іван Чэрскі нарадзіўся 3 мая 1845 года ў радавым маёнтку Свольна Дрысенскага павета (цяпер – Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці). У час вучобы ў Віленскім дваранскім інстытуце Чэрскі прымае ўдзел у паўстанні Кастуся Каліноўскага. Пакаранне – канфіскацыя маёмасці і ссылка ў Сібір. У гэты суровы край наш зямляк трапіў бяспраўным ссыльным, але здолеў стаць адным з самых вядомых яго даследчыкаў. Месяцамі ён прападаў у экспедыцыях, даследуючы геаграфію, геалогію, палеанталогію рэгіёна. Яго працы былі высока ацэнены не толькі расійскай, але і сусветнай навуковай грамадскасцю.

Атрымаўшы ў 1885 годзе доўгачаканую амністыю, Чэрскі пераязджае ў Санкт-Пецярбург. Працуе ў музеі Акадэміі навук, выступае з дакладамі, піша аб'ёмныя навуковыя працы. Пры першай жа магчымасці наведвае родную Віцебшчыну. А потым – зноў у экспедыцыю, вярнуцца з якой яму было не наканавана. Па дарозе на практычна недаследаваны паўночны ўсход Сібіры Іван Дзяменцьевіч сур'ёзна захварэў, але вярнуцца назад адмовіўся – толькі наперад! Памёр вучоны 25 чэрвеня 1892 года і быў пахаваны ў далёкім Сярэднекалымску.

У Сібіры імя волата навукі Івана Чэрскага і сёння ведае кожны. Адно з аб'яднанняў нашых суайчыннікаў у гэтым рэгіёне – Іркуцкае таварыства беларускай культуры – носіць імя Чэрскага. Памятныя даты, звязаныя з жыццём і дзейнасцю вучонага, члены аб'яднання заўсёды адзначаюць асабліва. У юбілейныя гады нават ажыццяўляюць узыходжанне на пік Чэрскага, пакідаючы там памятныя знакі.

Востраў у Карскім моры, мыс і гарадскі пасёлак на Чукоцкім паўвостраве, вяршыня і перавал на Паміры і нават падлёдная раўніна ў Антарктыдзе названы ў гонар ураджэнца Магілёва знакамітага палярніка Ота Шміта. Як вядома, беларускіх каранёў у Ота Юльевіча няма, але Магілёў па праву можна лічыць яго малой радзімай. У гэтым горадзе 30 верасня 1891 года ён з'явіўся на свет, пражыў першыя дванаццаць гадоў, навучаўся ў Магілёўскай мужчынскай гімназіі. Менавіта на беларускай зямлі былі закладзены тыя якасці асобы, што далі яму магчымасць стаць знакамітым на ўвесь свет даследчыкам.

Дзейнасць Ота Шміта была шматграннай, але ў гісторыю ён увайшоў у першую чаргу як кіраўнік найбуйнейшых савецкіх арктычных экспедыцый. Замежная прэса называла яго Чырвоным Калумбам. Шміт узначаліў шэсць экспедыцый, кожная з якіх зрабіла значны ўклад у справу асваення Арктыкі. У час экспедыцыі 1932 года савецкія палярнікі на ледакольным параходзе «Сібіракоў» упершыню ў гісторыі прайшлі Паўночны марскі шлях без зімоўкі, за адну навігацыю. І хаця наступную экспедыцыю Шміта на параходзе «Чалюскін» спасцігла няўдача, самі «чалюскінцы» і лётчыкі, якія іх выратавалі, паказалі свету прыклад сапраўднай мужнасці і сілы духу.

Дзякуючы Ота Шміту ў Арктыцы быў адкрыты шэраг новых астравоў, створана сетка палярных станцый. За арганізацыю першай у свеце дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс» ён быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

У гонар першага консула Расійскай імперыі ў Японіі і аўтара першага японска-рускага слоўніка Іосіфа Гашкевіча названы заліў у Японскім моры бліз Карэі. Іосіф Антонавіч не толькі нарадзіўся на беларускай зямлі, пад Рэчыцай, але і правёў на радзіме апошнія гады свайго жыцця. Пасля выхаду ў адстаўку з дыпламатычнай службы ён набыў маёнтак Малі пад Астраўцом, дзе працягваў займацца навуковай працай,


**Іван Чэрскі**


**Ота Шміт**


**Іосіф Гашкевіч**



Эдуард Пякарскі



Гаўрыіл Ціхаў



Сямён Косберг

даследуючы пытанні паходжання японскай мовы.

На ніве лінгвістычнай навукі пакінуў значны след і ўраджэнец Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці Эдуард Пякарскі, які першы адкрыў свету скарбніцу якуцкай мовы. За ўдзел у рэвалюцыйным таварыстве «Зямля і воля» Пякарскі ў 1881 годзе быў адпраўлены ў ссылку ў Якуцію. Пачаўшы вывучаць якуцкую мову па неабходнасці, ён быў здзіўлены яе багаццем і самабытнасцю. Наш суайчыннік з'яўляецца аўтарам шэрагу этнаграфічных прац, складальнікам акадэмічнага выдання «Узоры народнай літаратуры якутаў». Галоўная праца жыцця Эдуарда Пякарскага – трохтомны «Слоўнік якуцкай мовы» – перавыдаецца да гэтага часу. Прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі Рэспублікі Саха (Якуція) адзначаюць, што з гадамі гэтая праца не толькі не траціць сваёй актуальнасці, а, наадварот, набывае яшчэ большае значэнне. Пякарскага лічаць у гэтым далёкім краі «бацькам якуцкай літаратуры». Яго імя носіць вуліца ў горадзе Якуцку.

## І неба, і зямля…

Імя выдатнага астранома Гаўрыіла Ціхава можна знайсці на карце не толькі Зямлі, але і іншых планет. У гонар нашага суайчынніка названа вуліца ў казахстанскім горадзе Алматы, кратары на Месяцы, Марсе, а таксама малая планета.

Нарадзіўся Гаўрыіл Адрыянавіч Ціхаў 19 красавіка 1875 года ў мястэчку Смалявічы Мінскай губерні (цяпер – райцэнтр Мінскай вобласці). Пазней у сваёй аўтабіяграфічнай кнізе «60 гадоў каля тэлескопа» Ціхаў вельмі цёпла ўспамінаў сваё беларускае дзяцінства.

Гаўрыіл Адрыянавіч стаяў ля вытокаў стварэння ў 1946 годзе Акадэміі навук Казахскай ССР, дзе працяглы час узначальваў сектар астрабатанікі. У 1959 годзе быў абраны ганаровым членам Акадэміі навук БССР. Ён аўтар больш як 230 навуковых прац, шэрагу новых методык, але ў гісторыю увайшоў у першую чаргу як даследчык Марса.

Цікавасць да «марсіянскіх даследаванняў» Ціхава і вучоных, і простых савецкіх грамадзян была велізарная. Залы, у якіх ён выступаў з лекцыямі, заўсёды былі перапоўненыя. За навуковымі працамі савецкага астрабатаніка ўважліва сачылі і за мяжой. Дзейнасць Гаўрыіла Ціхава – значны ўклад у справу даследавання Чырвонай планеты і ўвогуле космасу. І калегі-астраномы паклапаціліся, каб належным чынам увекавечыць яго памяць. Кратар Ціхава на Марсе знаходзіцца на поўдні планеты, у так званых землях Праметэя паблізу раўніны Элада, яго дыяметр – 110 км. Названы ў гонар вучонага кратар на адваротным баку Месяца мае памер амаль 84 км у дыяметры. Малая планета 2251, якая таксама носіць яго імя, знаходзіцца ў поясе астэроідаў паміж Марсам і Юпітэрам. Яна была адкрыта 19 верасня 1977 года ў Крымскай астрафізічнай лабараторыі.

Ёсць на Месяцы і кратар, названы ў гонар вядомага савецкага канструктара, спецыяліста ў галіне авіяцыйных і ракетных рухавікоў Сямёна Косберга. Акрамя таго, яго імя носіць вуліца ў расійскім горадзе Варонежы. Ураджэнец горада Слуцка быў адным з першых канструктараў, якія заклалі фундамент савецкай авіяцыйнай, а пасля і ракетнай тэхнікі. Косберг зрабіў значны асабісты ўклад у вялікую сусветную падзею – палёт чалавека ў космас. Мала хто ведае, што, акрамя знакамітага «Паехалі!», Юрый Гагарын адразу пасля старту яшчэ радасна ўсклікнуў: «Косберг спрацаваў!». Гэта азначала, што спрацавала апошняя ступень ракеты, дзякуючы чаму касмічны карабель змог выйсці на арбіту.

Імем іншага выдатнага вучонага савецкага фізіка-тэарэтыка, аднаго з заснавальнікаў сучаснай тэорыі гарэння, дэтанацыі і ўдарных хваляў Якава Зяльдовіча, які нарадзіўся ў Мінску 8 сакавіка 1914 года, названы малая планета і вуліца ў Маскве.

Ёсць у расійскай сталіцы і вуліца, якая ўвекавечвае імя сусветна вядомага савецкага авіяканструктара, стваральніка знакамітых самалётаў «Су» Паўла Сухога. Ён аўтар больш як 50 арыгінальных тыпаў самалётаў, ролю якіх у развіцці ваеннай авіяцыі цяжка пераацаніць. Дарэчы, дзякуючы апошнім даследаванням радаслоўнай Паўла Сухога, стала дакладна вядома, што на беларускай зямлі ён не толькі нарадзіўся і вырас, тут жылі некалькі пакаленняў яго продкаў.

## Уздоўж галоўнага праспекта

На картах Расіі і Украіны ўвекавечана імя таленавітага металурга, заснавальніка савецкай школы доменшчыкаў Міхаіла

Куракі. У гонар нашага земляка названы адзін з цэнтральных праспектаў расійскага Новакузнецка, вуліцы ўкраінскіх гарадоў Данецк, Краматорск, Янакіева, Магнітагорск, Марыупаль, Днепрапятроўск.

Міхаіл Курака нарадзіўся 23 верасня 1872 года ў радавым маёнтку ў вёсцы Казелле Магілёўскай губерні (цяпер – Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці). Працуючы на металургічных прадпрыемствах поўдня Украіны, беларус заслужыў рэпутацыю майстра доменнай справы. Акрамя таго, ён актыўна займаўся ўдасканаленнем тэхналогіі плаўкі, імкнуўся зрабіць больш бяспечнай працу рабочых, шмат якіх гінула ў той час у выніку аварый. А арганізаваная Куракам на металургічным заводзе ў Юзаўцы (цяпер Данецк) першая ў Расійскай імперыі школа доменшчыкаў дапамагла падрыхтаваць свае ўласныя кадры, якія паступова замянялі на прадпрыемствах краіны замежных спецыялістаў.

У 1917 годзе маладая савецкая ўлада даручыла вядомаму металургу Міхаілу Кураку будаўніцтва сучаснага металургічнага камбіната ў Кузнецку. Пачалася напружаная праца над праектам, але, на жаль, скончыць яе нашаму земляку не давялося. Ён захварэў на тыф і памёр 8 лютага 1920 года. Аднак прагрэсіўныя задумы і распрацоўкі Куракі былі ўвасоблены пры будаўніцтве завода. Справу годна завяршыў яго сябар і вучань, вядомы металург, будучы акадэмік Іван Бардзін.

Сёння праспект Міхаіла Куракі ў Новакузнецку – адна з галоўных транспартных магістраляў горада. А магіла-пантэон выдатнага металурга, размешчаная непадалёк ад Новакузнецкага металургічнага камбіната, з'яўляецца аб'ектам культурнай спадчыны федэральнага значэння.

## Аддаючы даніну таленту

У шэрагу замежных гарадоў ёсць вуліцы, названыя ў гонар нашых суайчыннікаў, якія вызначыліся на ніве культуры і мастацтва. Часцей за ўсё – сусветна вядомых класікаў беларускай літаратуры. Так, вуліцы Якуба Коласа можна сустрэць у Астрахані, Валгаградзе, Абаяні, Растове-на-Доне, Уфе, Пярмі, Данецку, Кіеве, Крывым Розе, Вільнюсе. Вуліцы Янкі Купалы ёсць у Валгаградзе, Іркуцку, Казані, Ніжнім Ноўгарадзе, Орску, Чабаксарах, Кіеве, Крывым Розе, Луцку, Львове, Стрыі, Сумах, Херсоне. У 2012 годзе ў ізраільскім горадзе Ашдод, пабраціме горада Брэста, з'явіўся сквер Янкі Купалы. Вуліца Максіма Багдановіча ёсць у Ялце, дзе вядомы беларускі паэт пражыў свае апошнія дні і пахаваны.

Цэлым суквеццем назваў ушанаваны сусветна вядомы паэт з беларускімі каранямі Адам Міцкевіч. Яго імя носяць вуліцы і плошчы ў шэрагу польскіх гарадоў, а таксама Вільнюсе, Санкт-Пецярбургу, Рыме, Стамбуле, Тбілісі, Кіеве, Львове і іншых населеных пунктах свету. У гонар знакамітага паэта нават названы кратар на Меркурыі.

Наш зямляк пісьменнік-этнограф Адольф Янушкевіч вядомы менш, у тым ліку і ў Беларусі. Між тым у яго гонар на-



Якаў Зяльдовіч



Павел Сухі



Міхаіл Курака



Праспект М. Куракі ў Новакузнецку



Адольф Янушкевіч

званы вуліцы ў сучаснай і былой сталіцах Казахстана Астане і Алматы, і ён сапраўды заслужыў гэтую пашану.

А. Янушкевіч нарадзіўся 9 чэрвеня 1803 года ў Нясвіжы. Яго бацька Міхал Янушкевіч служыў у вядомых магнатаў Радзівілаў, а хросным бацькам Адольфа быў Міхал Еранім Радзівіл. Будучы пісьменнік скончыў Нясвіжскую дамініканскую школу. Вучыўся на літаратурным факультэце Віленскага ўніверсітэта, належаў да Таварыства блакітных, блізкага да філарэтаў. Менавіта Адольф Янушкевіч быў прататыпам аднаго з герояў знакамітай паэмы Адама Міцкевіча «Дзяды» – Адольфа.

За ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1830–1831 гадоў Адольф Янушкевіч быў адпраўлены ў ссылку ў Сібір. Праз некаторы час, каб павялічыць свае шансы на амністыю, ён паступіў на дзяржаўную службу. Працуючы ў Памежным упраўленні сібірскіх казахаў, Янушкевіч прымаў удзел у перапісе мясцовага насельніцтва. У час шматмесячных паездак у бяскрайнія стэпы ён вывучыў казахскую мову, пазнаёміўся са многімі жыхарамі юрт. Аб сваіх назіраннях, адкрыццях, уражаннях наш зямляк падрабязна пісаў у асабістым дзённіку і лістах блізкім. Яго таленавітае пяро закранала самыя розныя бакі жыцця казахаў таго часу, ствараючы цікавыя і жывыя апісанні. Пасля смерці пісьменніка гэтыя нататкі былі надрукаваны асобнымі выданнямі спачатку на польскай, а потым на рускай, казахскай і беларускай мовах. Іх лічаць вельмі каштоўнай крыніцай інфармацыі аб адносна малавядомым качавым перыядзе ў казахскай гісторыі.



Восіп Цадкін

Імя Адольфа Янушкевіча сёння знакавае як для беларускай дыяспары Казахстана, так і для казахстанскай творчай інтэлігенцыі, якая выступае за захаванне этнічнай культуры свайго народа. Вядзецца праца па ўвекавечанні памяці Янушкевіча і папулярызацыі яго этнаграфічных даследаванняў.

На картах гарадоў па-за межамі Беларусі можна сустрэць прозвішчы нашых суайчыннікаў, якія вызначыліся не толькі на ніве літаратуры. У Парыжы ёсць вуліца, названая ў гонар вядомага скульптара і мастака ўраджэнца Віцебска Восіпа Цадкіна. Работы гэтага майстра прадстаўлены ў буйнейшых музеях Еўропы і ЗША, больш за 30 яго скульптур усталяваны ў еўрапейскіх гарадах.

Захаваліся звесткі, што ў «віцебскі перыяд» свайго жыцця Цадкін быў знаёмы з Маркам Шагалам і Юдалем Пэнам, заснавальнікам прыватнай Віцебскай школы малявання і жывапісу. Будучы скульптар скончыў Віцебскае гарадское чатырохкласнае вучылішча, дзе, акрамя асноўных дысцыплін, вывучаў і сталярна-такарную справу.

У 1909 годзе Цадкін едзе пакараць Парыж. У 1928 годзе ён стварае адну з самых вядомых сваіх скульптур – трохметровага «Арфея», якога купляюць улады Парыжа. У 1937 годзе іншая работа майстра – «Вяшчун» – упрыгожвае адзін з павільёнаў Сусветнай выставы ў Парыжы. Вяршыняй пасляваеннай творчасці скульптара лічыцца помнік «Разбураны горад», усталяваны ў галандскім Ратэрдаме.

Майстар заснаваў у Парыжы ўласную школу скульптуры. Ён быў узнагароджаны Вялікім нацыянальным прызам Францыі па мастацтву, а таксама адзначаны званнем кавалера ордэна Ганаровага легіёна. Парыж не забыўся пра Восіпа Цадкіна. Вуліца, названая ў яго гонар, размяшчаецца ў XIII акрузе французскай сталіцы. У парыжскай студыі майстра на вуліцы д'Асас працуе музей, дзе прадстаўлены яго работы, створаныя ў розныя перыяды. Акрамя таго, скульптуры Цадкіна можна сустрэць па ўсім Парыжы –




Помнік «Разбураны горад» у Ратэрдаме

такі падарунак гораду зрабіў у свой час мэр французскай сталіцы Жак Шырак.

Вуліцы ў Валгаградзе, Крывым Розе, Харкаве, шэрагу польскіх гарадоў, а таксама вуліца і сквер у Вільнюсе названы ў гонар аднаго з буйнейшых кампазітараў XIX стагоддзя ўраджэнца Ігуменшчыны (цяпер – Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці) Станіслава Манюшкі. Палякі лічаць яго родапачынальнікам польскай класічнай оперы, літоўцы адзначаюць плённасць «віленскага перыяду» жыцця кампазітара. Разам з тым Манюшкам створаны шэраг твораў, звязаных з беларускімі традыцыямі і культурай. Менавіта ён – аўтар першай у гісторыі оперы, пры пастаноўцы якой са сцэны загучала беларуская мова. Творчасць Станіслава Манюшкі аказала значны ўплыў на развіццё розных галін музычнага мастацтва Беларусі.

## З полымя ваенных гадоў

Узгадаем і нашых суайчыннікаў, чые імёны на карце – удзячнасць нашчадкаў за подзвігі, здзейсненыя імі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У гонар Героя Савецкага Саюза Феадосія Смалячкова названы вуліца і пасёлак у складзе Санкт-Пецярбурга.

Феадосій Смалячкоў – ураджэнец вёскі Падгор'е Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля заканчэння школы ён прыехаў вучыцца ў Ленінград, дзе працаваў яго старэйшы брат Васіль. Але ўсе жыццёвыя планы парушыла вайна. 23 чэрвеня 1941 года Феадосій прыйшоў у ваенкамат з просьбай адправіць яго на фронт. Паколькі хлопцу яшчэ не было 18 гадоў, у войска яго не ўзялі – запісалі ў народнае апалчэнне.

Смалячкова лічаць пачынальнікам масавага снайперскага руху на Ленінградскім фронце. Франтавая газета «Вперед» рэгулярна пісала пра тое, як расце яго асабісты снайперскі рахунак, імя меткага беларуса было ў той час шырока вядома. Лічыцца, што, зрабіўшы 126 стрэлаў, ён знішчыў 125 фашыстаў. Пры гэтым малады стралок не толькі сам трапна біў ворага, але і вучыў снайперскаму майстэрству іншых салдат. Феадосій Смалячкоў загінуў ад кулі нямецкага снайпера 15 студзеня 1942 года. Яму было ўсяго 18 гадоў.

На скрыжаванні вуліцы Смалячкова і Вялікага Сампсоніеўскага праспекта ў Санкт-Пецярбургу стаіць помнік салдату Феадосію Смалячкову. На будынку былой школы фабрычна-заводскага навучання, якую скончыў наш зямляк, прымацавана мемарыяльная дошка. А на месцы яго пахавання на Чэсменскіх могілках усталяваны абеліск.

У расійскім горадзе Арле ёсць вуліца, названая ў гонар яшчэ аднаго нашага земляка Героя Савецкага Саюза Міхаіла Антонава. Ён нарадзіўся 11 сакавіка 1923 года ў пасёлку Касцюковічы, рос у пасёлку Краснаполле, таксама на Магілёўшчыне. У 1940 годзе яго прызвалі ў армію. А потым – вайна. Пасля заканчэння Ульянаўскага танкавага вучылішча хлопец адразу адправіўся на фронт. Ваяваў пад Сталінградам. Дзевятнаццацігадоваму лейтэнанту даверылі камандаваць танкавым узводам – і ён не падвёў. Саслужыўцы ўспаміналі яго як адважнага і рашучага, але адначасова не па гадах разважлівага камандзіра.

У баях пад Арлом беларус удзельнічаў ужо ў якасці камандзіра танкавай роты. Сем разоў вадзіў сваю роту ў атакі, у выніку якіх ворагу былі нанесены значныя страты. Загінуў Міхаіл Антонаў 4 жніўня 1943 года ў баі за сам горад. Яго рота ўварвалася на пярэдні край нямецкай абароны. Танк адважнага беларуса ўступіў у бой першым: знішчыў 4 артылерыйскія гарматы, 3 аўтамабілі ворага і амаль узвод пяхоты праціўніка. Але раптам па іх адкрыла агонь замаскіраваная нямецкая супрацьтанкавая гармата. Усе члены экіпажа згарэлі ў танку…

Сёння ў Арле імя Міхаіла Антонава ўвекавечана не толькі ў назве вуліцы. У ваенна-гістарычным музеі горада яно залатымі літарамі выгравіравана на мармуровай стэле разам з імёнамі іншых герояў, якія загінулі ў баях на Арлоўшчыне. На магіле беларуса на Траецкіх могілках горада Арла пастаўлены абеліск.

***

Шмат геаграфічных назваў у розных краінах свету звязаны з такімі знакавымі дзеячамі нашай гісторыі, як Кастусь Каліноўскі, Тадэвуш Касцюшка, Францыск Скарына. Сустракаюцца на карце свету імёны і іншых выхадцаў з беларускай зямлі. Увогуле «беларускі след» можна знайсці амаль на ўсіх кантынентах. І гэта выклікае гонар за Беларусь, якая, нягледзячы на сваю няпростую гісторыю, здолела ўзгадваць столькі дастойных сыноў.

**Аксана МЫЦЬКО**



Станіслаў Манюшка



Феадосій Смалячкоў



Міхаіл Антонаў